КРАЕВЕДЧЕСКИЙ
СОЛИГОРСКА



На варце марскіх рубяжоў Радзімы.

Былы матрос стаў гарняком

# ДРУГАЯ ПРАФЕСІЯ

Ішоў жнівень 1959 года. Да капроў, што высіліся побач з вёскай Чыжэвічы, падыходзіў чалавек у матроскім адзенні. Вочы яго ўважліва прыглядаліся да ўсяго новага. Тут было чаго здзіўляцца. Яшчэ нядаўна на палетках шумела збажына, а цяпер у неба вымахнулі магутныя капры, сведкі таго, што людзі пачалі будаваць шахты. Шахты ў Беларусі, на роднай зямлі!

Таму вельмі захацелася Канстанціну Астрауху (гэта быў ён) працаваць шахцёрам, набыць другую спецыяльнасць, даставаць з-пад зямлі багатыя скарбы.

— Што, цікавішся?—спытаў у матроса брыгадзір праходчыкаў Міхаіл Нясмелаў.— Давай, брат, да нас, прымем. Нам смелыя хлопцы патрэбны.

Мара Канстанціна збылася. Яго прынялі на вялікую будоўлю, дапамаглі набыць спецыяльнасць праходчыка. І сёння ён з павагай і падзякай адклікаецца аб тых, хто прыняў яго ў свой калектыў.

— Выдатныя, сардэчныя людзі дапамаглі мне, — і ў вачах гарняка свеціцца радасць за сваю прафесію. — Міхаіл Нясмелаў навучыў мяне працаваць праходчыкам, Мікалай Папоў — кіраваць лябёдкай.

Толькі ці мог на гэтым супакоіцца Канстанцін? Не, яму хацелася большага. А тут якраз адкрыліся курсы машыністаў горнапраходчых камбайнэў. Як лепшага праходчыка, Астрауха накіравалі на гэтыя курсы. Ён паспяхова закончыў іх і цяпер працуе ў камсамольска - маладзёжным экіпажы, які ўзначальвае Мікалай Мацюшын. Гэта адзін з лепшых гарняцкіх калектываў рудніка. Сам брыгадзір — вопытны майстар сваёй справы, выдатны арганізатар, чулы таварыш. Мацюшын — член ЦК камсамола Беларусі.

Працоўнымі справамі калектыву Мацюшына, у якім працуе Астравух, можна ганарыцца. Майскае заданне па праходцы гэты экіпаж выканаў на 127 працэнтаў, у чэрвені звыш плана пройдзена 60 пагонных метраў гарызантальных выпрацовак. Ужо выканана ліпеньскае заданне. А колькі яшчэ новых працоўных перамог чакае ўперадзе працавітых салігорскіх гарнякоў, сярод якіх працуюць і былыя матросы, такія энергічныя, як і Канстанцін Астраух.

Л. БУЛГАК,

дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, машыніст горнапраходчага камбайна.